**429.** Спішыце сказы, раскрываючы дужкі. Падкрэсліце займеннікі як члены сказа.

1. Дазволь жа нізка пакланіцца *(ты)*, бацькоў маіх зямля *(І. Скурко)*. 2. Збудавалі ля шашы *(сябе)* хатку мурашы[сн] *(У. Шпадарук)*. 3. Усіх чаруе лірыка *(сябе)*, высокімі пачуццямі пранізвае *(М. Вяршынін)*. 4. Дзвіна! Дзвіна! І слова звоніць, як толькі ўспомніш пра *(ты)* *(П. Броўка)*. 5. Быць самім *(сябе)* і не лёгка[ф], і не проста *(М. Рудкоўскі)*. 6. Я таксама духмянага[м] чаю з іван-чаю *(сябе)* заварыў *(Х. Гурыновіч)*.

**430.** Выканайце інтэрактыўнае заданне «Правапіс займеннікаў».

## § 68. Прыналежныя займеннікі

**431.** Прачытайце тэкст. Вызначце яго тып. Абгрунтуйце сваю думку.

Кожны з нас — Я. А калі мы сабраліся ў групу або калектыў, з'яўляецца яшчэ адно важнае слова — **мы**. Пры гэтым ты сам заўважаеш, што, прыходзячы дадому, расказваеш: «Мы сёння пісалі дыктант», «Наш клас у нядзелю пойдзе ў тэатр». Чаму так адбываецца? А таму, што для кожнага чалавека вельмі важныя[м] справы таго калектыву, у які ён уваходзіць. Гэта твая сям'я, твой клас, твае сябры *(Паводле выдання «Чалавек і свет»)*.

Якое значэнне маюць словы *наш, твой*? На прыналежнасць якой асобе яны ўказваюць? Якія вы яшчэ ведаеце прыналежныя займеннікі?

**Прыналежныя** займеннікі ўказваюць на прыналежнасць прадмета асобе ці іншаму прадмету: *я* — ***мой***, *ты* — ***твой***, *ён, яно* — ***яго***, *яна* — ***яе***, *мы* — ***наш***, *вы* — ***ваш***, *яны* — ***іх***: *Матуля, колькі весняга святла* ***тваё*** *імя святое навявае!..* (З. Марозаў).

У сказе прыналежныя займеннікі з'яўляюцца азначэннем: *За* ***наш*** *духмяны каравай сягоння чалавек спакойны* (В. Гардзей).



Правообладатель Национальный институт образования

Прыналежныя займеннікі змяняюцца па родах, ліках і склонах, як прыметнікі: ***мой, мая, маё — мае; мой — майго, майму, маім***. Іх пачатковая форма — мужчынскі род, адзіночны лік, назоўны склон.

**432.** Прачытайце табліцу. Якая часціна мовы мае падобныя формы?

| Склон | Скланенне займенніка *мой (маё, мая, мае)* | | |
|---|---|---|---|
| Н. | *мой* *маё* | *мая* | *мае* |
| Р. | *майго* | *маёй (мае)* | *маіх* |
| Д. | *майму* | *маёй* | *маім* |
| В. | як Н. ці Р. *маё* | *маю* | як Н. ці Р. |
| Т. | *маім* | *маёй (маёю)* | *маімі* |
| М. | *(у) маім* | *(у) маёй* | *(у) маіх* |

Праскланяйце словазлучэнне *твой край*. Параўнайце канчаткі займеннікаў *твой* і *мой*. Складзіце з імі два сказы, падкрэсліце як члены сказа.

У родным і давальным склонах адзіночнага ліку ў займенніках ***мой, твой*** і ***маё, тваё*** пішацца ***й***: не пахваліў ***майго***, ***твайго брата; не заўважыў майго, твайго кацяняці***; паслаў ***майму, твайму брату; даў майму, твайму кацяняці.***

У вінавальным склоне адзіночнага ліку пры адушаўлёных назоўніках мужчынскага роду гэтыя займеннікі таксама пішуцца з ***й***: ***заўважыў майго, твайго брата.***

**433.** Прачытайце табліцу. З якім асабовым займеннікам суадносіцца займеннік *наш*? У чым асаблівасць яго змянення?

| Склон | Скланенне займенніка *наш (наша, нашы)* | | |
|---|---|---|---|
| Н. | *наш*□ *наш***а** (н. р.) | *наш***а** (ж. р.) | *наш***ы** |
| Р. | *наш***ага** | *наш***ай** **(-ае)** | *наш***ых** |
| Д. | *наш***аму** | *наш***ай** | *наш***ым** |
| В. | як Н. ці Р. *наш***а** | *наш***у** | як Н. ці Р. |
| Т. | *наш***ым** | *наш***ай** **(-аю)** | *наш***ымі** |
| М. | *(па) наш***ым** | *(па) наш***ай** | *(па) наш***ых** |



Правообладатель Национальный институт образования

Праскланяйце словазлучэнне *ваш лепшы сябар*. Зрабіце вывад пра змяненне займеннікаў, што ўказваюць на прыналежнасць 1-й і 2-й асобам.

Складзіце выказванне на тэму «Наш край».

***Звярніце ўвагу!***

Спецыяльнага займенніка, які ўказвае на прыналежнасць 3-й асобе, у беларускай мове няма. У яго функцыі ўжываецца форма роднага склону асабовага займенніка: ***яго, яе, іх***.

Прыналежныя займеннікі ***яго, яе, іх*** не скланяюцца: *Генадзь даў яе брату добрую параду. Хлопец захапляўся іх братам.*

**434.** Прачытайце верш «Галя». Якія колеры брала для вышыўкі дзяўчына? Як яны суадносяцца з беларускай сімволікай?

Вышывала[с] ты сарочку  
пад ігрушай у садочку.  
Васільковы[м] брала колер  
на сваім радзімым полі.  
А зялёны брала ў лесе,  
дзе свае спявала песні.  
Пурпуровы* — на каліне,  
што красуе на даліне.  
На каўнерыку, рукавах  
зіхаціць узор яскрава.

*У. Дубоўка.*

На прыналежнасць якой асобе ўказвае слова *сваё (свае)*?

Прыналежны займеннік ***свой (сваё, свая, свае)*** указвае на прыналежнасць асобе ці прадмету: ***Я*** *спяваю* ***сваю*** *песню.* ***Ты*** *спяваеш* ***сваю*** *песню.*

Займеннік ***свой (сваё, свая, свае)*** змяняецца па родах, ліках і склонах, як займеннікі *мой* і *твой*. У родным, давальным і вінавальным (пры адушаўлёных назоўніках) склонах у займенніках *свой* і *сваё* пішацца ***й***: *не знайшоў свайго сябра, дaручыў свайму сябру, бачу свайго сябра.*

**435.** Прачытайце тэкст, раскрываючы дужкі. Вызначце колькасць сэнсавых частак у ім.

### Конік і Скры́пачка

Аднойчы дзед падарыў Коніку *(свой)* Скрыпачку.

— Вось, трымай. Цяпер *(твой)* чарга.



Правообладатель Национальный институт образования



— Я не змагу іграць так, як ты!
— І не трэба. У кожнага *(свой)* песня.
— А пра што будзе спявацца ў *(мой)* песні?
— Пра тое, што раскажа *(твой)* сэрца.

Над..шоў вечар. Стала ціха-ціха. З..лёны Конік узяў Скрыпачку. На лу..е загучала яго песня. Маленькая сціплая Скрыпачка стварала *(свой)* гукамі чаро..ныя м..лодыі. І гэта песня напа..няла *(сябе)* усё навакол..е. І разам з ёй у кожнага складалася ўласная песня — песня *(свой)* с..рца *(Паводле В. Караткевіч)*.

Ці абудзіў Конік чужыя песні?

Назавіце прыналежныя займеннікі, вызначце іх род, лік, склон.

Запішыце апошні абзац тэксту, раскрываючы дужкі, устаўляючы прапушчаныя літары. Растлумачце напісанне арфаграм і форм займеннікаў.

## § 69. Указальныя займеннікі

**436.** Прачытайце. З якога твора ўзяты ўрывак тэксту? Падбярыце да яго загаловак.

Ледзь Сямён пакінуў гару, як яго сустрэў велізарны[сл] чорны сабака. Ідзе лоўчы за **гэтым** сабакам. **Той** спыняецца і позіркам паказвае на дрэве глушцоў. Сямён стрэліў некалькі разоў, а **столькі** птушак упалявала!

З **таго** часу Сямён стаў найслаўнейшым[м] паляўнічым. **Той** чорны сабака кожны раз сустракаў яго ў лесе і дапамагаў лоўчаму. З **такой** дапамогай Сямён **столькі** рознай дзічыны здабываў, што хапала і панам, і сялянам *(Паводле Я. Баршчэўскага)*.

Вызначце, на што ўказваюць выдзеленыя словы (прадмет, прымету ці колькасць)?

Растлумачце значэнне слова *лоўчы*.

Займеннікі ***гэты, той, такі, гэтакі, столькі, гэтулькі*** ўказваюць на прадметы, іх прыметы і колькасць і называюцца **ўказальнымі**.


Правообладатель Национальный институт образования